# Не хапіла работы
# Нічыпар Парукаў

**Аўтар - чорным колерам**

**Маці - чырвоным колерам**

**Таня - сінім колерам**

**Ліза - зялёным колерам**

***Чорны курсіў не трэба гаварыць. Ён падказвае дзеянні і рухі героям.***

---------------------------------------------------------------------------

Адыходзячы на работу, маці паклікала да сябе дачок — Лізу і Таню — і сказала:

— Прыбярыце са стала, памыйце талеркі і лыжкі, падмяціце чысценька падлогу на кухні.

— Добра, мамачка.  Не хвалюйся - *сказала Таня.*

- Усё зробім, як трэба, — *адказала Ліза.*

Пайшла маці, а дзяўчынкі пачалі думаць.

- Я прыбяру са стала, а ты памыеш посуд - *сказала Таня*
- Добра. А пакуль паляжу, каб табе не перашкаджаць - *сказала Ліза.*

Праз некаторы час Таня пытаецца ў Лізы.

- Чаму ж ты талеркі не мыеш?
- Я баюся, што разаб'ю. Маме гэта не спадабаецца.
- Добра. Я сама памыю. А ты падмяці падлогу.

Пачала Ліза падмятаць і стала чыхаць.

- Я ад пылу магу захварэць. І спіна нешта баліць.
- Давай я падмяту.

Вярнулася маці дадому і бачыць: стол засланы чыстым абрусам, талеркі і лыжкі вымыты і акуратна расстаўлены ў шафе для посуду. А кухня чыста-чыста падмецена. І смецце вынесена.

— Малайцы, дзеткі, добра зрабілі, — *пахваліла маці дзяўчынак.*

Ёй хацелася даведацца, хто ж з дачок што рабіў.

— Каторая з вас, мае дарагія памочніцы, са стала прыбрала?

— Я, — *голасна адказала Таня.*

— А хто талеркі і лыжкі памыў і паставіў на месца?

— Я, — *зноў адказала Таня.*

— Ну, а ты, Ліза, што рабіла? — *глянула маці на старэйшую дачку.*

— Я... я нічога, мама, не рабіла... Таня ўсё забрала сабе. Мне не хапіла работы, — *ціха адказала дзяўчынка і вінавата апусціла галаву.*